ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

1 ЛЮТАГА 1996 года чацвер

№2 (1738)

*Ведай нашых!*

## Гульні для юрыстаў студэнцкага ўзросту

При падтрымцы Асацыяцыі студэнтаў-юрыстаў на базе Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў сярэдзіне студзеня прайшоў Міжнародны конкурс студэнтаў-юрыстаў, якія займаюцца міжнародным правам.

Па выніках адборачнага тура Беларусь будзе прадстаўленая камандай Белдзяржуніверсітэта (Кацярына Кузняцова, Кім Латыпаў, Анна Гурыновіч, Георгі Балакчыеў — студэнты III курса факультэта міжнародных адносін, а іх кіраўнік Юрый Лепяшкоў — таксама нядаўні студэнт).

Фінальныя гульні адбудуцца ў канцы сакавіка ў Злучаных Штатах. Дарэчы, у Амерыцы гэты конкурс вельмі прэстыжны: за магчымасць апынуцца сярод яго ўдзельнікаў вядуць барацьбу каманды па розных гарадах, акругах, штатах. Папулярнасць конкурсу — гэта ўдзел у ім і каманд іншых краін: прыязджаюць нават студэнты-юрысты з Малайзіі, Пакістана, Філіпін, Індыі. Сам конкурс уяўляе сабой гульню, дзе будучыя юрысты выступаюць у ролі ісцоў і адказчыкаў у прыдуманых гіпатэтычных сітуацыях на судзе ў Гаазе. Конкурс праходзіць толькі на англійскай мове, таму наша каманда не прэтэндуе на прыз лепшаму аратару, але ўвогуле за перамогу яна паспрачаецца.

## Вучоны савет у Раўбічах

***З 1 па 3 лютага ў Раўбічах адбудзецца нарада-семінар кіраўнікоў ВНУ Рэспублікі Беларусь.***

Асноўныя праблемы для абмеркавання — рэформа агульнаадукацыйнай школы, стварэнне адукацыйнай прасторы СНД, упраўленне вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, якасць падрыхтоўкі спецыялістаў — сведчаць, што да Гарварда і Оксфарда Беларусі далёка не толькі ў прасторавых адносінах. А раз так, то рашэнне вучоных мужоў на чале з міністрам адукацыі і навукі В.І.Стражавым і яго першым намеснікам В.П.Стаўровым сабрацца на савет выглядае дастаткова лагічным. Чакаюцца і прадстаўнікі з Расіі, Украіны, краінаў Балтыі.

У нарадзе-семінары ў новай для сябе якасці саветніка міністра адукацыі і навукі прыме ўдзел Ф.М.Капуцкі. У мінулым месяцы ён адсвяткаваў сваё 66-годдзе і пакінуў пасля заканчэння тэрміну абрання пасаду рэктара буйнейшай ВНУ рэспублікі — Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

***Наталля Савельева***

*Весткі з галоўнага корпуса*

У 1995 годзе ў Белдзяржуніверсітэце абаранялі доктарскія дысертацыі 93 кандыдаты. Званне доктара навук нададзена наступным супрацоўнікам нашага універсітэта:

Брыгадзін Пётр Іванавіч — прарэктар БДУ, атрымаў званне доктара гістарычных навук,

Віленчыц Баляслаў Баляслававіч — вядучы навуковы супрацоўнік НДІ прыкладных фізічных навук, атрымаў званне доктара фізіка-матэматычных навук,

Кіклевіч Аляксандр Канстанцінавіч атрымаў званне доктара філалагічных навук,

Ляшчоў Сяргей Міхайлавіч — дацэнт кафедры аналітычнай хіміі БДУ, атрымаў званне доктара хімічных навук,

Мячкоўскі Станіслаў Антонавіч — дацэнт кафедры аналітычнай хіміі БДУ, атрымаў званне доктара хімічных навук,

Рашэтнікаў Сяргей Васільевіч — прарэктар БДУ, атрымаў званне доктара палітычных навук,

Ухванава Ірына Фёдараўна атрымала званне доктара філалагічных навук.

*Семінары*

## "ІНФАРМАТЫКА-96"

У рамках семінара "Міжнароднае супрацоўніцтва і развіццё вышэйшай адукацыі ў Беларусі" і міжнароднай выставы "Вышэйшая адукацыя ў Беларусі" 5-7 сакавіка Белдзяржуніверсітэт праводзіць цыкл інфармацыйна-рэкламных лекцый і прэзентацый "Інфарматыка-96". Прыняць удзел у семінары запрашаюцца прафесійныя работнікі прыкладнога праграмнага забеспячэння, спецыялісты, якія маюць вопыт эксплуатацыі сучасных інтэгрыраваных пакетаў і прыкладных праграм, а таксама кіраўнікі, менеджэры і пастаўшчыкі камп'ютэрнай тэхнікі на беларускі рынак.

На гэтым семінары кожны зможа і на іншых паглядзець, і сябе паказаць, выступіўшы, напрыклад, з дакладам. Асноўная тэматыка дакладаў такая: "Агляд і параўнаўчы аналіз новага пакалення камп'ютэрнай тэхнікі", "Сучасная інфармацыйная тэхніка", "Праграмнае забеспячэнне бухгалтарскага і эканамічнага прызначэння".

Адзначым, што семінар "Інфарматыка" у Белдзяржуніверсітэце праводзіцца ўжо ў чацвёрты раз і штогод прыцягвае шырокае кола спецыялістаў. Сярод яго пастаянных удзельнікаў — вядомыя фірмы ИП COMPUTERLAND, ЗАО ПУШЕ, НТО ТОП-СОФТ, ИП MICROEXPRESS, СП МАКТЕХМИНСК, СП БЕЛАВМ, СП БЕЛСТАРЛЕТТ і інш.

Запрашаем прыняць удзел І Вас.

Адрас арганізатара: г.Мінск, вул. Бабруйская, 9, пакоі 404, 410 (БДУ, корпус бухгалтэрыі); тэл. 26-58-95.

## Да Дня беларускай навукі

У канцы студзеня адбылася навуковая сесія Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, прысвечаная Дню беларускай навукі. Сярод арганізатараў сесіі — Акадэмія навук Беларусі, Міністэрства адукацыі і навукі, Акадэмія аграрных навук Рэспублікі Беларусь. Прысутнічалі спікер парламента Беларусі С.Шарэцкі, яго намеснік Г.Карпенка. Адкрыў сесію віцэ-прэм'ер У.Гаркун. Прысутных павіншаваў з Днём беларускай навукі міністр адукацыі і навукі В.Стражаў. Выступіў з уступнай прамовай і вёў сесію прэзідэнт АНБ Л.Сушчэня.

Усяго было прадстаўлена шэсць дакладаў, сярод якіх быў даклад прарэктара па вучэбнай рабоце БДУ, доктара філасофскіх навук, прафесара, загадчыка кафедры філасофіі і метадалогіі навукі Анатоля Ізотавіча Зеленкова "Філасофія навукі: сучасныя парадыгмы і праблемнае поле".

***Анастасія Кухарская***

## Бясплатнае наведванне Луўра

**Пра міжнародны студэнцкі білет многія студэнты ведаюць пакуль што толькі па чутках. Той, хто карыстаўся ім у час замежных падарожжаў, заставаўся задаволеным. Але большасць студэнтаў толькі ведае, што гэты білет дае права на нейкія ільготы ў некаторых краінах свету.**

**Людзі, якія валодаюць студэнцкімі білетамі ISIC, маюць права на наступныя ільготы і паслугі: скідка ад 25 да 50 працэнтаў на чыгуначныя білеты як мясцовага, так і міжнароднага накірунку ў Аўстрыі, Бельгіі, Венгрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Грэцыі, Егіпце, Ізраілі, Іспаніі, Італіі, Канадзе, Латвіі, Літве, Нарвегіі, Польшчы, Славакіі, Чэхіі, Швейцарыі, а таксама скідка на білеты на ўнутраныя і міжнародныя рэйсы на самалёты і аўтобусы.**

**У Грэцыі, Італіі, Латвіі, Турцыі прадастаўляюцца таксама скідкі на марскі і рачны транспарт.**

**Міжнародны студэнцкі білет дае права на 50-працэнтную скідку ці нават на бясплатнае наведванне музеяў, галерэй, замкаў, мясцовых славутасцей, фестываляў... Уяўляеце, скідка ў 50% на ўваходныя білеты ў буйнейшыя музеі Італіі? Ці, скажам, бясплатнае наведванне Луўра?..**

**Існуюць таксама скідкі на экскурсіі і экскурсійнае абслугоўванне, на пражыванне і харчаванне ў спецыяльных маладзёжных гасцініцах, універсітэцкіх і інстытуцкіх інтэрнатах, скідка на набыццё тавараў у пэўных крамах. У многіх краінах існуюць спецыяльныя бюро, якія змогуць даць падрабязную інфармацыю аб усіх відах скідак на тавары, білеты і паслугі разнастайных гарадоў той ці іншай краіны.**

**Уладальнік міжнароднага студэнцкага білета становіцца членам унікальнага шматмільённага студэнцкага клуба, дзе кожны атрымлівае больш ведаў, вопыту ў час падарожжаў з дапамогай студэнцкіх арганізацый ва ўсім свеце.**

***К.Ткачэнка***

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** грамадзянскага працэсу і працоўнага права; педагогікі; біяхіміі; замежнай журналістыкі і літаратуры; фізіялогіі раслін; фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў і методыкі выкладання геаграфіі; арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў; англійскай мовы гуманітарных факультэтаў;

**ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ** радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі (0,25 стаўкі);

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** фізікі паўправаднікоў; тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі; неарганічнай хіміі; арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў; аналітычнай хіміі; фізічнай электронікі; лазернай фізікі і спектраскапіі; тэорыі і гісторыі дзяржавы і права; канстытуцыйнага права; грамадзянскага працэсу і працоўнага права; педагогікі; рускай літаратуры; англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў; англійскай мовы гуманітарных факультэтаў; сусветнай і айчыннай гісторыі (0,25 стаўкі); археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін; эканамічных навук; замежнай журналістыкі і літаратуры; стылістыкі і літаратурнага рэдагавання; агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі; агульнай фізікі;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** агульнай матэматыкі; раманскіх моў; англійскай мовы гуманітарных факультэтаў; фізічнага выхавання і спорту;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці; фізічнага выхавання і спорту.

Тэрмін конкурсу -- адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" **1 лютага 1996 года.**

*Алімпіяды*

***Сёлета факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Белдзяржуніверсітэта запрашае навучэнцаў і школьнікаў прыняць удзел у юбілейнай, пятай па ліку алімпіядзе па матэматыцы і інфарматыцы.***

Упершыню яе правялі ў 1991/92 навучальным годзе, і за мінулыя гады алімпіяда набыла значную папулярнасць сярод школьнікаў: больш за 900 чалавек прынялі ў ёй удзел, 80 з іх атрымалі права паступлення на факультэт без уступных экзаменаў, а цяпер менавіта яны ўваходзяць у лік лепшых студэнтаў ФПМІ.

Алімпіяда па матэматыцы і інфарматыцы пройдзе ў тры туры (першы — завочны). Удзельнікамі яе могуць быць навучэнцы сярэдніх навучальных устаноў і асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю.

Лепшыя ўдзельнікі завочнага тура атрымаюць запрашэнне ў Мінск ці ў свае абласныя цэнтры на другі тур, які пройдзе ў канцы сакавіка — пачатку красавіка 1996 года. Заключны тур алімпіяды будзе праводзіцца ў канцы красавіка — пачатку мая ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. На яго таксама будуць запрошаныя пераможцы абласных алімпіяд і мінскай гарадской алімпіяды па матэматыцы.

Заключны тур алімпіяды будзе праводзіцца ў 2 дні. У першы дзень зранку — пісьмовая работа, па выніках якой будуць давацца рэкамендацыі на вуснае субяседванне з членамі прыёмнай камісіі, якое адбудзецца на наступны дзень.

# Палажэнне аб правілах унутранага распарадку ў інтэрнатах Белдзяржуніверсітэта

**I раздзел.** ***Прапускная сістэма***

1. Жыхарам інтэрната выдаюцца пропускі, якія прад'яўляюцца дзяжурнаму пры ўваходзе ў інтэрнат.

2. Уваход у інтэрнат для жыхароў адкрыты з 6.00 да 24.00.

3. Пабочныя асобы дапускаюцца ў студэнцкія інтэрнаты штодзённа з 9.00 да 22.00 і не пазней 23.00 абавязаныя пакінуць інтэрнат.

**Заўвага: у час экзаменацыйнай сесіі ўваход у інтэрнат дазваляецца толькі студэнтам універсітэта. У час канікулаў асобам, якія не пражываюць у інтэрнаце, уваход у інтэрнат забаронены, за выключэннем замежных студэнтаў пры прад'яўленні імі адпаведнага дакумента.**

4. Грамадзяне ў нецвярозым стане, а таксама асобы, якія не маюць пропускі, у інтэрнат не дапускаюцца.

5. Наведвальнік пры ўваходзе ў інтэрнат прад'яўляе дакумент, які сведчыць асобу, і рэгіструецца ў кнізе ўліку наведвальнікаў.

6. Студэнт, які запрасіў наведвальніка, абавязаны сустрэць госця на вахце і пакінуць у дзяжурнага свой пропуск. Пры сыходзе госця ў кнізе робіцца адзнака аб часе яго сыходу і заўвагі, калі яны ёсць. Студэнт, які запрасіў госця, нясе поўную адказнасць за паводзіны госця і яго своечасовы сыход з інтэрната.

7. У выпадку парушэння "Правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах БДУ" пабочнымі асобамі, апошнія могуць быць пазбаўленыя права наведваць інтэрнат на канкрэтны час ці канчаткова. Жыхар інтэрната ў сувязі з такім парушэннем таксама можа быць пазбаўлены права прыёму гасцей альбо на яго можа быць накладзена дысцыплінарнае спагнанне. Гэтае рашэнне прымаецца студсаветам інтэрната.

**II раздзел.** ***Заахвочванні і санкцыі***

1. Студэнты, аспіранты, слухачы падрыхтоўчага аддзялення, якія пражываюць у інтэрнатах, выконваюць "Правілы ўнутранага распарадку ў інтэрнатах БДУ" і актыўна ўдзельнічаюць у рабоце па забеспячэнню нармальных жыллёва-бытавых умоў і вольнага часу жыхароў, могуць быць узнагароджаныя граматай, прадстаўленыя да матэрыяльнага ўзнагароджання.

2. За парушэнне "Правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах БДУ" на жыхароў могуць быць накладзеныя наступныя санкцыі:

— папярэджанне,

— вымова,

— строгая вымова (засяленне на наступны год пасля двухтыднёвай адпрацоўкі на карысць інтэрната) ці незасяленне на наступны год,

— высяленне з інтэрната,

— адлічэнне з універсітэта.

3. За з'яўленне ў нецвярозым стане, распіванне спіртных напіткаў, пашкоджанне маёмасці, бойкі ў інтэрнаце жыхары адлічваюцца з універсітэта і высяляюцца з інтэрната.

4. Заахвочванні і санкцыі жыхарам інтэрната выносяцца загадам па БДУ па прадстаўленню адміністрацыі інтэрната, студсавета пры ўзгадненні з аддзелам па справах моладзі, дэканатам факультэта і прафкамам студэнтаў.

***Падрыхтавана па рашэнню Савета БДУ аддзелам па справах моладзі***

Конкурсы

***Ва універсітэце працягваецца конкурс-агляд "Знак Белдзяржуніверсітэта". Рэдакцыя газеты прапануе вашай увазе некалькі эскізаў, прадстаўленых у аддзел па справах моладзі. Вашыя меркаванні чакаюць па тэлефону: 68-70-98.***

Постфактум

# "Дыялог дзеля будучыні"

**З 26 па 28 студзеня праходзіў Маладзёжны Форум грамадскіх арганізацый пад назвай "Дыялог дзеля будучыні", падрыхтаваны Нацыянальнай Радай маладзёжных суполак. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі камсамольскай арганізацыі Беларусі, Задзіночання беларускіх студэнтаў, маладзёжнай фракцыі БНФ, Партыя Свабоды, "Славянский Собор" і інш.**

**Першы дзень прайшоў пад лозунгам "Хто я такі? Беларусь, у якой я жыву". Абмяркоўвалася пытанне аб'яднання маладзёжных суполак (на сённяшні дзень у Міністэрстве юстыцыі іх зарэгістравана каля 50). Другі дзень Форума меў сваім лозунгам "Хто я такі? Беларусь, якую ты выбіраеш", а трэці — "Хто мы такія? Беларусь, якая нас выбірае".**

**Форум даў магчымасць сустрэцца разам прадстаўнікам беларускай моладзі і абмеркаваць пытанні, якія датычацца палітычнага, культурнага, эканамічнага жыцця нашай дзяржавы.**

**У канцы вясны Нацыянальная Рада маладзёжных суполак плануе правесці яшчэ адзін Усебеларускі Форум, які аб'ядноае значную большасць маладзёжных арганізацый нашай краіны.**

***У.Гнутаў***

Сакрэт фірмы

*У сярэдзіне студзеня прайшоў II Нацыянальны кангрэс маладых палітыкаў і дзелавых людзей "Беларусь на парозе двух стагоддзяў і двух тысячагоддзяў", арганізаваны Беларускай асацыяцыяй маладых палітыкаў пры садзеянні Фонду Фрыдрыха Эберта і Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра. Асноўная яго задача — канструктыўны дыялог паміж палітычнымі лідэрамі, структурамі дзяржаўнай улады і грамадствам.*

*Сярод удзельнікаў кангрэса былі прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, маладыя бізнесмены краіны, а таксама парламентарыі з 20 замежных краін. Былі падведзеныя вынікі дэмакратычных пераўтварэнняў у дзяржаве за апошнія чатыры гады, абмеркаваныя праблемы стварэння рынку капіталу ў постсацыялістычнай краіне і г.д.*

• • •

*Да нядаўняга часу буйнейшая ВНУ Гродна і вобласці (Гродзенскі дзяржаўны універсітэт) мела толькі 34-е месца сярод ВНУ Беларусі па забяспечанасці вучэбнымі і навуковымі плошчамі ў разліку на аднаго студэнта. У бягучым годзе гэты паказчык павінен троху палепшыцца: па рашэнню гарвыканкама універсітэту перадалі 3 будынкі, размешчаныя ў цэнтры горада. Цяпер тут будуць працаваць фізіка-тэхнічны факультэт, ягоныя лабараторыі, а таксама інавацыйна-тэхнічны цэнтр.*

# Сёння студэнт — заўтра прэзідэнт

***Жыў закаханы студэнт,***
***Цяжка было студэнту:***
***Высах студэнт ушчэнт,***
***А потым не стала і шчэнту***

***Алег Лойка***

Студэнцкае жыццё яшчэ зусім нядаўна складалася з наступнага: "вучоба і каханне", "інтэрнат і каханне", "бульба і каханне". Якія ж з дадзеных складнікаў засталіся сёння? Дабавілася новых кампанентаў — гэта несумненна, а вось некаторыя з іх, мажліва, назусім зніклі для некаторых студэнтаў, як, напрыклад, тыя штогадовыя восеньскія паездкі на ўборку бульбы ў калгасы, за што студэнтаў празвалі "бульбаўбoрачным камбайнам" (цяпер паспрабуй пракарміць плойму тых маладых пражорлівых галчанят), а вось састаўныя часткі таго жыцця непазнавальна змяніліся. Не ведаю пра каханнне, ці засталося яно як абавязковая ўмова існавання ў сённяшніх студэнтаў (напэўна ж, яно ёсць, але якое?), а што мазаіка студэнцкіх гадоў напоўнілася новымі праблемамі, дык гэта факт. Ва ўжытак дападкіх навучэнцаў увайшла новая тэрміналогія — "бакалаўр", "магістр", "рынак", "баксы", "праезд", "шоу", "фонд", "камерцыя", "самаўладкаванне" і інш.

Але чамусьці зусім яшчэ нясмела вядзецца гаворка пра студэнцкае самакіраванне, сістэму камунальных і агульнаадукацыйных паслуг, клубы па інтарэсах, конкурсы, фестывалі, свабодны рынак ідэй, алімпіяды, універсіяды, рэйтынгі, прэстыж прафесіі. Апошнімі часамі загаварылі нават наогул аб немэтазгоднасці выхавання саміх студэнтаў. Мабыць, непатрэбна яно!

Моладзь — другая генерацыя, новы, па сутнасці, народ краіны. Уявім цяпер сабе тыя непазнавальныя змены ў нашай паўсядзённай рэчаіснасці, якія адбываюцца штогод пад уплывам бурлівай дзейнасці сотні тысяч маладых няўрымслівых творчых прафесіяналаў у самых розных галінах народнай гаспадаркі: эканомікі, культуры, сацыялогіі, прававых сферах, а таксама ў псіхалогіі, філасофіі, палітыцы, тэхнізацыі, у арганізацыі свабоднага часу. Нашы "парнічкі", "цяплічкі" яшчэ не арыентуюцца на масавы прыток новых свежых сіл спецыялістаў высокага класа, скіраваных у заўтрашні дзень, мы ўсё яшчэ задавальняемся "вырошчваннем у прабірках" асобных індывідуумаў — маладых вундэркіндаў, у лепшым выпадку, баімся прапусціць таленты. Але мы па вопыту многіх мінулых гадоў ведаем, што студэнт-пяцёрачнік яшчэ часамі працуе ледзь на тройку, а выцягваюць асноўную нагрузку на любой працы "окопные лошадки" — звычайная цягла- вая сіла: вечныя чацвёрачнікі і непрыкметныя ў часы вучобы ў вышэйшай школе сераднячкі. Вось на іх мы аніяк, здавалася, не спадзяваліся, а маса іх ускладвае на свае плечы асноўны цяжар аб дні сённяшнім і, як правіла, аб дні заўтрашнім.

Знаходзіцца ў залатой сярэдзіны — гэта не значыць кідацца з агню ды ў полымя, гэта не адмаўленне ад саміх сябе, ад сваіх прынцыпаў, не выкарчоўванне свайго ўласнага "я", гэта нават не выдзіранне ўласнага шлунку за ўласны язык, калі ўсе вантробы выварочваюцца.

Мы не лепшыя і не горшыя. Мы такія, як мы ёсць. На нашу долю выпала, што мы не былі самымі горшымі, але і не сталі самымі лепшымі. Нас увогуле чакае мноства расчараванняў — адмаўленне ад уласнай выключнасці, чалавекабогаабранасці, месіянерства, утапічнага камунізму, якім мы прапітаны.

Мы ўсе павінны перастаць верыць у міфы, у казку-быль, у тое, што калі-небудзь пратрэм вочы ранiцой і прачнемся вядомымі, багатымі. Нельга захацець атрымаць усё і адразу. Але, з другога боку, калі ты такі разумны — дык чаму такі бедны?..

Нельга станавіцца падобнымі да Бурыданавага асла, які не ведаў з якога воза сена есці, ды так і памёр з голаду. Мы нібыта замерлі ў нязручнай і вельмі недарэчнай позе. Хто знойдзецца сказаць нам слова: "Адамры!"?

Значыць, неабходна пераарыентацыя ў самім падыходзе да падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Стаўка робіцца на глібокі прафесіяналізм. Не тое, што стаіць за чалавекам, важна сёння, а тое, што значыць ён сам, што ўмее рабіць і як адносіцца да прафесійнай дзейнасці. "Што ён умее?" -- усё часцей і часцей гучыць гэтае пытанне ўжо сёння пры ўладкаванні на самастойную працу. А хутка мы дарасцем і да пошукаў маладых ініцыятыўных і дзелавых спецыялістаў, будзем вучыць іх мэтава, падтрымліваць у навучанні, каб потым мець добрую аддачу ад свайго работніка. Паточная, серыйная падрыхтоўка спецыялістаў павінна стаць паштучнай, індывідуалізаванай, глыбокапрафесійнай. Выпускнік вышэйшай навучальнай установы тады будзе смела канкураваць на рынку рабочай сілы сярод іншых маладых спецыялістаў, павінен ведаць сабе цану, многае ведаць і многае ўмець. Вяскоўцы жартуюць: "Тады ты навучышся касіць, калі зможаш за ўсімі ісці ў пракосе ды яшчэ і перагаворвацца з суседам", Мала карысці з работніка, які баіцца адарвацца ад кніжкі, не ўмее ўжыць па-сапраўднаму тое, чаму навучыўся за доўгія гады ў вышэйшай школе. Неабходна кемлівасць, дзелавітасць, працавітасць, арганізатарскія здольнасці.

"Навучышся — працуюць",— распаўсюджаны выраз прадугледжвае сёння актыўнае ўключэнне студэнцтва ў агульную стваральную працу беларускага народа па фармаванню новых эканамічных узаемаадносін у грамадстве, у сацыяльнай і культурных сферах. Вучобу варта наблізіць да задач і патрэб агульнага будаўніцтва новага жыцця.

Французскі філосаф XVI стагоддзя Мішэль Мантэнь у кнізе "Вопыты" пісаў так: "Я ж лічу, што да дваццаці гадоў душа чалавека цалкам даспявае, як і павінна быць, і што яна раскрывае ўсе свае магчымасці. Калі да гэтага ўзросту душа чалавечая не выявіла з поўнай відавочнасцю сваіх сілаў, дык яна ўжо ніколі гэтага не зробіць. Менавіта да гэтага ўзросту вашыя прыродныя якасці і дабрачыннасць павінны праявіць сябе з поўнай сілай і прыгажосцю або ж яны ніколі не выявяць сябе". Памятаеце ў паэта:

Раз шип не острый с первых дней,
Потом не станет он острей.

З усіх вядомых нам выдатных дзеянняў чалавечых, якімі б яны ні былі, яны здзяйсняліся да трыццацігадовага ўзросту.

Так было ў старажытнасці, так і ў наш час. Прыкладаў шмат. Добрая палова жыцця многіх вядомых людзей была пражыта за кошт славы, якую яны займелі ў маладыя гады; пазней тыя вядомыя людзі таксама былі, заставаліся слыннымі, выдатнымі дзеячамі, але толькі ў параўнанні з іншымі, але не з самім сабою. Рэдка ў каго веды і вопыт растуць разам з жыццём, але, ізноў жа як сцвярджаюць філосафы, хуткасць, рэакцыя, трываласць, мужнасць і іншыя душэўныя якасці, уласцівыя нашаму грамадству ў цэлым, слабеюць і змяняюцца з часам. Як памятаем, гэта было адным з галоўных козыраў бальшавікоў — стаўка на моладзь.

З гадамі мы больш трацім, чым набіраем. Відавочна, сёння нам варта выступаць і скардзіцца не на тое, што законы занадта доўга не вызваляюць ад спраў штодзённых і абавязкова службовых, а на тое, што яны, нашы законы, доўга не дапускаюць нас да іх.

У інтарэсах дзяржавы — даць як мага даўжэй выконваць свае абавязкі вопытным працаўнікам, але, з другога боку, неабходна адкрыць дарогу маладым як мага раней. У рынкавых адносінах узнікае неабходнасць пашырыць прафесійную падрыхтоўку на выхадзе, асабліва тых выпускнікоў, якіх заказвае ўстанова, фірма, прадпрыемства. Трэба даць мажлівасць усім прайсці перападрыхтоўку.

Неабходна канцэпцыя непарыўнай прафесійнай адукацыі. Трэба ствараць умовы, пры якіх маглі б існаваць новыя формы і нязвыклыя яшчэ на першы погляд структуры, даваць поўны блок непадзельнай падрыхтоўкі спецыяліста. Вучыць жа і асяроддзе, сам дух ВНУ ("тут каля вугла пастаіш — большаму навучышся",— казалі ў народзе); мае значэнне творчая атмасфера, тэарэтызаванне, але з практычнымі выхадамі ў канкрэтнасць быцця, бо тут нават не столькі важна, чаму мы вучым, але — якія ўмовы мы ствараем для атрымання глыбокіх ведаў.

У самім змесце падрыхтоўкі важнае месца займаюць гуманітарныя і прыродазнаўчыя навуковыя кампаненты. Гуманітарны цыкл выхоўвае асобу, садзейнічае станаўленню чалавечых якасцей, умацоўвае ў характары агульначалавечыя духоўныя высокамаральныя каштоўнасці. Перш, чым стаць спецыялістам, трэба стаць сапраўдным чалавекам, умець адказваць за свае ўчынкі, браць на сябе клопат пра "зерне" і "пра дзіця", адчуваць сябе грамадзянінам сваёй краіны, быць патрыётам Бацькаўшчыны.

Зноў жа, спецыяліст, які пытаецца "Хто напісаў "Паланез" Агінскага?" альбо "Колькі чалавек у квартэце?", які б таленавіты ён ні быў, аднолькава шкодны, як і той, хто мысліць выключна бюракратычнымі штампамі, навуковымі формуламі, тэхнічнымі выкладкамі.

Новая з'ява ў нашым навучанні — рэзкае павелічэнне ўдзельнай вагі ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі навукова-тэхнічнага кампаненту на ўсіх узроўнях і ў самых разнастайных сферах народнай гаспадаркі: інфарматыцы, матэматыцы, экалогіі, біялогіі, псіхалогіі, геаграфіі, фізікі.

Камп'ютэр стаў тэхнічным сімвалам стагоддзя, як і неабходнасць авалодваць замежнымі мовамі, пражываць не адно, а некалькі жыццяў.

Новае грамадства — індустрыяльнае — не можа дазволіць сабе анiякую падфарбоўку таго, што было, не пагаджаецца з прыватнымі новаўвядзеннямі, не ўдасканальвае старое. Яно дыктуе і яшчэ адчувальней будзе дыктаваць зусім новыя падыходы да жыцця. Ад кожнага студэнта ўсё мацней патрабуецца пакутлівая вынаходніцкая, пошукавая, прадпрымальніцкая (так, так! Менавіта прадпрымальніцкая, камерцыйная) дзейнасць, якая становіцца асновай існавання (адстаў — страціў!), самарэалізацыя і самавыяўленне асобы дзеля самога сябе найперш, але і для грамадства.

Памятаецца, яшчэ ў застойныя часы ў Амерыцы мне давялося жыць некалькі дзён у аспіранта навукова-даследчага інстытута, які займаецца праблемамі вакцынацыі ва ўмовах субтропікаў. У пакоі — бейсбольны мяч, саксафон, гітара, эскізы. "Я шукаю сябе",— заявіў малады спецыяліст. А знайшоў сваё прызванне ў навуцы. Так і кожнаму з нас давядзецца шукаць сваю лунку паміж "каменнымі жорнамі" рынaчных адносін, каб не быць раструшчанымі. Поспех выпускніка будзе ўсё меней залежаць ад знешніх фактараў, але болей — ад яго самога. Нават веды не назапасіш "на потым", вартасці свае не прыкладзеш да дыплома, не закрыешся заслугамі. Поспех — у асабістай кваліфікацыі, ва ўменні не прапусціць свой шанц, у разуменні таго, што твае веды, падыходы, розум заўсёды спатрэбяцца грамадству пры любых умовах.

Мае свой сэнс удача, усмешка фартуны і, як кажуць на Захадзе, уменне апынуцца ў неабходным час у неабходным месцы.

Не апошняе ў навучанні — эўрыстычны падыход: кожная з'ява, сума ведаў мусяць станавіцца для будучага спецыяліста сапраўдным адкрыццём.

"Блажен, кто смолоду был молод!"— усклікаў А.Пушкін. Юнацтва — шматабяцальнае. Гэта тая пара, калі можна стаць такім, як ніхто яшчэ не быў. У юнацтве ўсе — паэты, філосафы, таленавітыя будучыя вучоныя, "карыфеі эпохі" ды "на паўстагоддзя гeніі". Але маладосць — гэта і недахоп, які з гадамі праходзіць. Ды толькі пра нямногіх можна сказаць, што яны поўнасцю спраўдзілі высокае абяцанне юнацтва.

Спраўдзім! Станавіцеся прэзідэнтамі асацыяцый, фірмаў, фондаў, канцэрнаў.

***Уладзімір Навумовіч,***
***загадчык кафедры беларусазнаўства БДУ, дацэнт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі***

---



## "А я памру, калі перастану прымаць ванну двойчы ў дзень"

***Студэнты — народ усюдысны і цікаўны. Навіны ў студэнцкім асяроддзі распаўсюджваюцца з хуткасцю святла. Часта можна пачуць пытанне "А Вы ведаеце?.." і адказ "Ну хто гэтага не ведае!" Аднак існуюць і так званыя "хіты" — навіны, якія не губляюць сваёй значнасці на працягу доўгага часу і часта прыносяць за сабой безліч чуток і здагадак, пакуль не прыйдзе афіцыйнае пацвярджэнне ці абвяржэнне.***

***"Хіт" мінулага тыдня — размеркаванне, пра якое студэнты думалі, што яно даўно ўжо кануў у Лету. І таму, напэўна, вяртанне яго стала прычынай асаблівага настрою ў студэнтаў. Пахадзіўшы па журфакаўскіх калідорах, мы пачулі наступныя думкі:***

— Калі падыходзіць фармальна, дык размеркаванне з'яўляецца нормай. БДУ — гэта ж дзяржаўная установа. Студэнты атрымліваюць стыпендыю за кошт дзяржавы, у якой, як вядома, ёсць свае патрэбы. А калі сыходзіць з асабістага пункту погляду, то асабліва ў наш час неразумна звязваць чалавека і ставіць яго ў нейкія рамкі.

— На журфаку мы ўсё ж такі атрымліваем адукацыю гарадскую. Спецыялізуемся па культуры, палітыцы. А гэта значыць, што ў абласных газетах працаваць давядзецца не па профілю. І для творчага росту два гады будуць проста змарнаваныя. Уяўляеце, як за гэты час можа змяніцца ў сталіцы і палітычнае, і культурнае жыццё.

— У мяне спецыялізацыя "журналіст-міжнароднік". Ёсць перспектыўная праца, невялікі вопыт, які я наўрад ці змагу выкарыстаць у абласной газеце. Ужо сёння варта думаць аб будучай кар'еры. Губляць два гады не хацелася б.

— Лічу, што абласным цэнтрам больш патрэбныя, нават неабходныя, маладыя эканамісты. Цяжка зразумець, чаму за імі застаецца "свабодны" дыплом.

— А я памру, калі перастану прымаць ванну двойчы ў дзень. Лепей бы ў правінцыі без мяне...

— А мне што? Мяне задавальняе такая сістэма: не трэба ламаць галаву, куды ісці пасля заканчэння навучання. За цябе вырашаць...

***Падрыхтавала Паліна Грушына***

*Кнігазбор*

# Калі на клетцы слана пабачыш надпіс "буйвал"...

Ад чаго сёння найбольш пакутуюць гуманітарыі, акрамя спрадвечнага пытання: "Кому теперь в родном краю ты нужен?" Ад таго, што з кожным разам усё цяжэй і цяжэй выкройваць з і без таго невялікай зарплаты пэўную суму на патрэбную кнігу. Яшчэ Цыцэрон трапна заўважыў: "Дом, у якім няма кніг, падобны да цела, пазбаўленага душы". І таму якім цяжкім і непрадказальным ні было б наша жыццё, адмаўляючыся ад многіх матэрыяльных дабротаў, многія ўсё ж такі не могуць выключыць з ліку самага неабходнага "ежу духоўную".

Мартын Ідэн, герой аднайменнага твору Джэка Лондана, параўноўваў навуку са штурманскай рубкай, дзе захоўваюцца марскія карты. На гэтых картах усё ёсць, але павінен знайсціся Нехта, хто мусіць паказаць, дзе што ляжыць. Прызнацца, я нямала засмучаная тою акалічнасцю, што вось ужо другі год у кнігарнях застаецца незаўважаным зборнік аповесцяў замежных аўтараў "Гісторыя кахання". Зборнік названы па апошняй у ім аповесці Эрыка Сігала. Аднак, на маю думку, у ім прадстаўленыя творы больш глыбокія, і, каб імёны аўтараў былі вынесены на вокладку, гэты зборнік разышоўся б значна хутчэй, бо далёка не ўсе памятаюць знакамітае выказванне Казьмы Пруткова: "Калі на клетцы слана пабачыш надпіс "буйвал", не вер вачам сваім". Паспрабуем паглядзець, што змяшчае ў сабе някідкая на выгляд кніга.

Адкрывае зборнік знакамітая аповесць Рычарда Баха "Чайка па імені Джонатан Лівінгстон". Твор напісаны ў 1969, у перакладзе на рускую мову з'явіўся ў 1974 годзе ў часопісе "Иностранная литература". Аднак, шырокаму колу чытачоў стаў ён вядомы ў сярэдзіне 80-х, калі выйшаў асобнікам. Прыкладна ў гэты час у "Даляглядах" з'яўляецца пераклад Алеся Міхальчука.

Аповесць у сціслай форме змяшчае ключавыя ідэі творчасці Баха, якія пазней ён развівае ў "Палетах наяве", "Ілюзіях". Гэта — пошук дасканаласці, ідэалу, непрыняцце штодзённасці, спасціжэнне невядомага, таемнага, непазнанага. Аўтар уздымае адвечныя пытанні: хто мы? дзеля чаго існуем на гэтай планеце? хто намі кіруе? Аповесць пабудавана з вобразаў, у якіх увасоблена наша рэальнае жыццё. Вобраз птушкі невыпадковы, бо ў сусветнай міфалогіі з ім атаясамлівалася душа чалавека, гатовая ўзнесціся на неба. Душа, якая не ведае абмежаванняў. Душа, не абцяжараная зямнымі клопатамі. Душа, якая прагне дасканаласці. Менавіта ў пошуку дасканаласці аўтар бачыць сэнс жыцця. Як мудра гучаць словы Салівана, які сустрэў Джонатана ў іншым вымярэнні: "Ты птушка — адна на тысячы... Уяўляеш, праз колькі жыццяў трэба было нам прайсці, каб зразумець, што існуем мы не толькі дзеля яды і бойкі за ўладу ў чарадзе?.. Сто тысяч жыццяў, перш чым мы пачалі спасцігаць, што ёсць дасканаласць, і яшчэ сто, каб нарадзілася думка: мэта жыцця — знайсці гэтую дасканаласць і паказаць яе ўсім".

Так ужо здараецца ў нашым жыцці, што новае, нават калі яно вядзе да вызвалення, паказвае шлях у вышыню,— асуджаецца грамадствам. Ды знаходзяцца дзівакі, якія дапамагаюць іншым спасцігаць адвечныя ісціны, анічога не патрабуючы ўзамен. А часта мы нават не ведаем, адкуль прыходзіць гэтая дапамога. Проста адчуваем: ёсць нешта, што вядзе нас па жыцці. І калі чалавек дасягнуў пэўнай вышыні, ён становіцца настаўнікам і мусіць навучыць іншых таму, пра што даведаўся сам. Бо ў Чарадзе заўжды знойдзецца хаця б адна чайка, якой аднойчы захочацца парушыць межы звычайнасці і адчуць сябе вольнай.

Аповесць грэчаскага пісьменніка Костаса Варналіса "Сапраўдная апалогія Сакрата" ў перакладзе Міколы Бусла ў многіх адносінах развівае тэмы, узнятыя Бахам. (Хаця заўважым, што з'явілася яна раней — у 1931 годзе. Чытач "Даляглядаў" мог пазнаёміцца з ёй у 1992 годзе.) Аповесць — своеасаблівы позірк на падзеі дзён мінулых, але разам з тым гэта аналіз таго, што адбываецца зараз. Цікавы сам па сабе жанр, вынесены ў назву твора. Апалогія — гэта прамова ў абарону чаго-небудзь. Але Сакрат не абараняецца. Ён насмешлівы, іранічна паказвае заганы грамадства. Як і Бах, Варналіс уздымае праблему непрызнанага Генія, незразумелага натоўпу. "Натоўп, Грамадская Думка,— гаворыць аўтар вуснамі Сакрата, — гэта велізарны дварняк, прывязаны да кола на сонцы. Ён спіць беспрастанку ... і шалёна кідаецца на людзей, як толькі хто-небудзь памкнецца змяніць тое, з чым ён звыкся".

Чытаючы гэты твор, мы нібыта праз павелічальнае шкло глядзім на праблемы сённяшнія. Вельмі павучальна гучыць казка, расказаная Сакратам. Гаворка ідзе пра тое, як аднойчы злодзеі першай у свеце дзяржавы вырашылі ўпарадкаваць сваё жыццё. "Вы вольныя жыць, як вам хочацца,— звяртаюцца яны да наёмных, што сабраліся на плошчы,— зарабляць грошы і складваць іх у торбачку, піць, скакаць, пладзіцца і паміраць. А мы будзем вучыць вас... А хто схоча, хай піша вершы, выводзіць тэорыі і набывае сабе славу. Уладарыць будзеце вы, мы будзем толькі вамі камандаваць... Вы будзеце працаваць як хочаце, дзе хочаце і калі хочаце... Вы будзеце гінуць у сечах, а мы будзем жыць. І паколькі вы самі не здолееце зразумець сваіх інтарэсаў, каб ахоўваць іх і сябе, мы вас сілком прымусім рабіць гэта... Толькі адно мы вам забараняем — красці адно ў аднаго. Бо гэтак вы і нас зможаце абкрасці".

Пакінем гэтую цытату без каментарыяў, бо, словамі ўсё таго ж Сакрата, "чым болей розуму — тым больш турбот".

Вельмі раю прачытаць гэтую аповесць будучым юрыстам, палітыкам. Перад намі не толькі выдатны ўзор красамоўства, але і разважанні над праблемай дзяржавы як грамадскага інстытута, законнасці ў ёй і ролі так званага "вінціка ў апараце прымусу". Напрыканцы заўважым, што аповесць перакладалася на многія мовы свету. І на сённяшні дзень яна лічыцца ці не лепшым творам новагрэчаскай літаратуры.

Трэцяя аповесць можа быць таксама аднесенай да ліку філасофскіх. Гэта аповесць знакамітага польскага пісьменніка Ежы Анджаеўскага "Цемра зямлю ахінае" ў перакладзе Васіля Сёмухі. Яна пабудаваная на канкрэтным гістарычным матэрыяле. Тамаш Тарквемада — рэальная асоба, і для недасведчаных нагадаем, што менавіта ён выконваў абавязкі Вялікага інквізітара каралеўстваў Кастылія і Арагон у XV стагоддзі. Менавіта інквізіцыя — судова-паліцэйская ўстанова для барацьбы з ератыкамі — з'явілася тою цемраю, якая найбольш захапіла Іспанію. Аповесць не абмяжоўваецца толькі гістарычнымі фактамі. Яна ўзнімае пытанні сяброўства, славы, аддансці сваёй справе, вернасці абраным ідэалам. Мы зноў знаходзім тут цудоўны ўзор судовага працэсу — "складаную справу нейкага Ларэнца Перэза, рамесніка з Бургаліса". І калі такі святы і знакаміты чалавек, як Тарквемада надаваў гэтай справе такое значэнне, то, мусіць, і нам варта было б звярнуць на яе ўвагу.

Палеміка наконт таго, ці існуе сатана і ці з'яўляецца ён спраўцам зла на зямлі, выклікае пэўныя асацыяцыі з вобразам Івана Карамазава з яго ідэяй "Калі Бога няма, значыць усё дазволена". У гэтым накірунку можна правесці пэўныя паралелі паміж героем Дастаеўскага і героем Анджаеўскага. Абодва аўтары выкарыстоўваюць аднолькавую мадэль эвалюцыі сваіх герояў. Герой вынашвае і фармулюе нейкі тэзіс, ідэю: для Карамазава — што Бога няма, для Тарквемады — ідэя пакарання за богаадступніцтва. Далей герой жыве ў адпаведнасці з гэтай ідэяй. Але наступае момант, калі жыццё пачынае супярэчыць ёй. Карамазаў разумее, што не ўсё дазволена. У Тарквемады ўзнікае жаданне знішчыць створаную ім самім сістэму. "Я стварыў сістэму, але дзякуючы ёй і праз яе стварыў таксама людзей сістэмы. Што рабіць з імі, калі сістэма аказалася згубленым шаленствам. Як адкінуць тэрор, калі ён ужо здолеў нарадзіць людзей, якія ў ім толькі знаходзяць рацыю і сэнс свайго існавання? Знішчыць іх пры дапамозе таго ж тэрору?" І як вынік — крушэнне абодвух герояў.

Наступная аповесць Бернара Клавеля "Бацькава падарожжа" ў перакладзе Уладзіміра Палупанава прадстаўляе французскую літаратуру. Дзеянне аповесці абмежаванае часам — усяго некалькі сутак. Снежнымі днямі Кантэн адпраўляецца ў Ліён, каб высветліць, чаму ягоная дачка Марыя-Луіза не прыедзе святкаваць з сям'ёй Каляды. Аднак ён так і не знаходзіць яе, затое шмат даведваецца пра гарадское жыццё Марыі-Луізы — што ніколі не раскажа жонцы. Адметна, што ў аповесці не абмаляваны вобраз Марыі-Луізы. Яна прысутнічае нябачным ценем і паўстае перад намі праз успрыняцце і ацэнку тых, хто жыў з ёй побач, з кім яна сустракалася. Добра паказаны стан Кантэна, які не хацеў верыць у тое, што з кожным яго крокам па Ліёне рабілася відавочным.

І закрывае зборнік рамантычная гісторыя Олівэра Барэта і Джэні Кавілеры з аповесці Эрыка Сігала "Гісторыя кахання" ў перакладзе Алеся Асташонка. У ёй ёсць і недарэчнае спатканне, і сумесная праца, і гатоўнасць ахвяраваць сваімі інтарэсамі дзеля каханага чалавека, і праблема бацькоў і дзяцей, і неўладкаванасць жыцця, і першыя спрэчкі. І пякучы боль Олівэра, які ніколі не пакіне хлопца. І словы, сказаныя адной цудоўнай дзяўчынай, якое ўжо не было: "Каханне — гэта калі ні аб чым не трэба шкадаваць".

Вядомы англійскі публіцыст і гісторык Тамаш Карлейль неяк заўважыў: "Калекцыя кніг — той жа самы універсітэт". Зборнік "Гісторыя кахання" можа стаць цудоўным здабыткам для любой калекцыі і задаволіць нават самыя патрабавальныя густы. Аматары містыкі і непазнанага палятаюць наяве з Бахам. Філосафы ад прыроды разгледзяць складаныя праблемы чалавецтва быццам з самім Сакратам. Гісторыкі прасякнуць у атмасферу інквізітарскіх часоў. Псіхолагі пагрузяцца ў нялёгкія здагадкі Кантэна. А закаханых кране гісторыя кахання Олівэра і Джэні.

***Ганна Бутырчык***

**P.S. Калі вы паглядзіце на кошт зборніка, то выбар будзе зрабіць няцяжка, бо зараз і цэн такіх не бывае.**

## Студэнцкія прыкметы

***Калі...***

...выкладчык гаворыць, што ва універсітэце вучацца толькі пяць гадоў, значыць заўтра пачынаецца сесія.

•••

...у бібліятэцы табе прапануюць здаць кнігі, якія ты ўзяў яшчэ на першым курсе, значыць на чацвёртым яны табе ўжо не спатрэбяцца.

•••

...тое, аб чым распавядае выкладчык на лекцыі, ты ўжо ведаеш, значыць ты зноў трапіў у аўдыторыю, дзе займаюцца студэнты малодшага курса.

•••

...на заліку ты пачынаеш тануць, значыць ты заплыў на глыбейшую частку басейна, а выкладчык фізкультуры так і не навучыў цябе плаваць.

•••

...нягледзячы на шматлікія пераздачы "хвастоў" твой аднакурснік мае чырвоны дыплом, значыць вокладак іншага колеру ў продаж не паступала.

## *Гэта яшчэ трэба зразумець!*

***(Працяг. Пачатак у №1 за 18 студзеня 1996 г.)***

***МОЛЕКУЛЯРНАЯ ФИЗИКА***

- Если бы ручки паяльника были металлическими, то человек бы много не паял. Но так как в нём ручка деревянная, то человеку нечего бояться.
- Солёные молекулы передвигались и проникали в картошку.
- Мокрые молекулы притягивают друг друга.
- Если у вас спросят, в какой воде диффузия происходит быстрее, в холодной, или тёплой, то вы сразу ответите: "В тёплой". Почему? Потому, что при тёплой температуре диффузия происходит быстрее, чем при холодной (это письменный ответ!).
- Лёд— это замерзшее твёрдое тело. Оно образовалось в связи с тем, что вода при минусной температуре замерзает или превращается в лёд, а вода— это жидкость.
- Удалённая теплоёмкость.
- Калолитр.
- Коопеляры.
- При нагревании характер движения молекул увеличивается.
- Так как проволка нагревается, то плотность проволки увеличивается. Она не может достигать абсолютного нуля, а так как после абсолютной массы мы не знаем температуры, то она не может нагреваться.
- Весной когда льдина движется молекулы движутся как с водой.
- Ящик с повешенной температурой.
- Если кинул палку, она не раздробилась, потому что она крепкая.
- Жидкости и газы сохраняют свои формы.
- Из менее молеккулярного образуется более молекулярное.
- Одна молекула передвигается на место другой и в результате чернила распространяется. И со временем вода будет синенькой.
- Молекулы заморозков и ветра отталкиваются.
- В тёплую погоду молекулы движутся хаотичнее.
- Опыты показали, что для газов всякая температура имеет одно и то же значение.
- Банка присасывается к телу потому, что давление банки меньше давления тела.
- Влажность не может превышать 100%, потому что при выше этой влажности воздуха будет обсалютная вода.
- Так как частицы золота в несколько раз тяжелее воды, то их смешивать нельзя, объясняя силы тяжести.
- Результаты неточны, так как из пробирки вышло немного опыта.

***(Працяг у наступным нумары)***

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3

*1 лютага*
***Зак. 2000.***
***Т. 1000 экз.***

*220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412,*

**В.а. рэдактара Т.М. Казак**